

НАВОШТА КІРАЎНІКУ РАЁНА «ІНСТАГРАМ»? 4

СЯСЦЁР ХАТЫНІ — НА 78 БОЛЬШ 5



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 МАЯ 2022 г. СЕРАДА № 85 (29707)

КОРАТКА

• **Мінадукацыі будзе рэкамендаваць школьнікам пры падрыхтоўцы да іспытаў наведваць курс аб вайне.**

• Узровень вады ў рацэ Сож каля Гомеля падымаецца да небяспечна высокай адзнакі.



• **Памёр вядомы беларускі ўрач-нефролаг Аляксандр Сукала.**

• Беларускі тэнісіст Ягор Герасімаў прайграў на старце турніру ў Аўстрыі.

• **РТБД прадставіць прэм'еру спектакля «Альпійская балада» 6 і 7 мая.**

• Юныя байдарачнікі і канаісты паспаборнічаюць на турніры ў Брэсце. Адкрытыя рэспубліканскія спаборніцтвы па веславанні на байдарках і каноэ, прысвечаныя памяці абаронцаў Брэсцкай крэпасці, пройдуць 4-6 мая.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Нашы добрыя справы будуць найлепшай данінай яго светлай памяці»

## Прэзідэнт прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця помніка мітрапаліту Філарэту



Фота БелТА

**У дзень значнага хрысціянскага свята — Радаўніцы, калі прынята ўспамінаць самых дарагіх людзей, якія пакінулі гэты свет, у Мінску адкрылі помнік першаму Патрыяршаму Экзарху ўсяе Беларусі мітрапаліту Філарэту. Удзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця помніка прыняў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. У цырымоніі адкрыцця помніка таксама ўзяў удзел Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.**

Бронзавы манумент усталявалі каля цэнтральнага ўвахода ў Свята-Духаў кафедральны сабор. Помнік ніbыта сустракае і благаслаўляе жыхароў Мінска крыжом прападобнай Ефрасінні Полацкай, які трымае ў правай руцэ. Ушанаваць памяць уладыкі прыйшлі дзясяткі мінчан, многія нават сем'ямі. СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БРЫЛО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Геаграфія пастаўак беларускай прадукцыі з кожным годам пашыраецца, у тым ліку і па хлебе, і нашых кандытарскіх вырабах. У мінулым годзе нашы прадукты былі прадстаўлены на прылаўках у 44 краінах свету. У нас даволі нядрэнныя паказчыкі па экспарце харчовых тавараў былі ў 2021 годзе: тэмп росту каля 120 працэнтаў. Гэты год мы пачалі з прыкладна такім жа ростам».*

Прыёмная кампанія — 2022

# ПАДАЦЬ ЗАЯВУ НА ЦТ МОЖНА АНЛАЙН

## Але па пропускі давядзецца прыйсці асабіста...



**2 мая ў краіне распачалася рэгістрацыя абітурыентаў на цэнтралізаванае тэсціраванне. Зрабіць гэта трэба не пазней за 1 чэрвеня.**

Абітурыентаў чакаюць у пунктах рэгістрацыі ў будні з 9.00 да 19.00, а таксама па суботах 14 і 28 мая — з 9.00 да 18.00. Трэба мець на ўвазе, што 9 мая пункты рэгістрацыі працаваць не будуць. У абітурыентаў ёсць выбар: на ЦТ можна зарэгістравацца анлайн або прыйсці ў пункт рэгістрацыі асабіста.

Напрыклад, для падачы заявы на ўдзел у ЦТ можна запоўніць электронную форму на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў **https://regct.rikc.by** СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

# «Нашы добрыя справы будуць найлепшай данінай яго светлай памяці»

### ЁН БЫЎ СУМЛЕННЕМ НАЦЫІ

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што мітрапаліт Філарэт, без перабольшання, вялікі сучаснік, Герой Беларусі, чалавек, які быў не толькі духоўным айцом, але і сумленнем нацыі.

«Ён заўсёды казаў: «Дзе служыш — там і Радзіма». І даказаў усім сваім жыццём, што яго лёсам, яго Айчынай была наша Беларусь. А мы былі яго вялізнай любімай сям'ёй. Мітрапаліт Філарэт пражыў разам з нашай краінай усе самыя складаныя перыяды, працуючы не толькі на духоўнай ніве. Ён шмат сіл аддаў адраджэнню храмаў, прыходаў, манастыроў, развіццю багаслоўскай адукацыі», — згадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што па благаслаўленні ўладыкі на беларускую мову было перакладзена Святое Пісанне, устаноўлена свята ў гонар Сабора беларускіх святых. Мітрапаліт з радасцю браў удзел у цырымоніі ўзнагароджання прэміяй Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне».

«Яго таксама можна было сустрэць не толькі ў храмах, але і ў калідорах улады, калі, будучы дэпутатам Вярхоўнага Савета, уладыка ўдзельнічаў у станаўленні нашай незалежнай дзяржавы. На чале спецыяльнай камісіі ён наведваў чарнобыльскія рэгіёны, дапамагаючы ў пераадоленні наступстваў аварыі. Ён быў разам з людзьмі ў самыя цяжкія хвіліны», — падкрэсліў беларускі лідар.

Паводле слоў Прэзідэнта, мітрапаліт Філарэт быў міратворцам. У час халоднай вайны стаў узнімаць тэмы патрыятызму, антыфашызму, недапушчэння прымянення ядзернай зброі і спынення гонкі ўзбраенняў. З усесаюзных, міжнародных трыбун, а таксама са старонак перыёдыкі ён з прагнізлівай вастрынёй гаварыў аб тым, што занадта высокая цана заплачана савецкім народам за перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне. І таму для нас мір — гэта найвялікшае дабро.

«Я перакананы: і зараз, на нябёсах, побач са святымі заступнікамі Беларусі ён просіць аб міры і згодзе на нашай прыгожай Зямлі. Усе мы выдатна бачым, што біблейская бітва дабра і зла не скончана, яна і сёння ідзе на ўсёй планеце, пры розных абставінах і ў самых нечаканых абліччах. Чым падобнае супрацьстаянне заканчваецца, мы добра бачым на прыкладзе нашай роднай і брацкай Украіны. Але нездарма кажуць, што самы цёмны час — перад світаннем. У такі няпросты перыяд ясна відаць: хто вораг, а хто сябар», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

### ЗАПАВЕТ: ЗАХАВАЦЬ МІР І ЗГОДУ НА РОДНАЙ ЗЯМЛІ

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў Год гістарычнай памяці беларусы, якія перажылі нямала, зноў супрацьпастаўляюць заходняй крывадушнасці сваю спакойную мудрасць і памяркоўнасць.

«Больш за год прайшло, як уладыка не з намі, але ўсё яшчэ цяжка казаць пра яго ў мінулым часе. Не хапае яго голасу, нязменнай добразычлівасці, тонкага гумару, мудрай бацькоўскай парады, малітоўнай дапамогі. Але як духоўны запавет мы часта ўспамінаем адно з яго апошніх пасланняў, датаванае няпростым для нашай краіны жніўнем 2020 года. Там ёсць словы аб тым, што цяперашняя задача і абавязак нацыі — захаваць мір і згоду на роднай зямлі. Гэта нашая адказнасць перад Богам і перад нашчадкамі. І дадам: шануйце адно аднаго, беражыце мір і сваю краіну. Заўсёды памятайце словы мітрапаліта Філарэта, якімі ён заканчваў кожную пропаведзь: «Спяшайцеся рабіць дабро», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар падкрэсліў: нашы добрыя справы будуць найлепшай данінай светлай памяці мітрапаліта Філарэта.

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да ўсіх прысутных. Ён адзначыў, што Радаўніца — гэта светлае свята, якое шануецца, без перабольшання, усімі сумленнымі і добрымі людзьмі і нават нядобрымі. «Давайце сёння, хто яшчэ гэтага не зрабіў, згадаем нашых родных і блізкіх, хто, як мітрапаліт Філарэт, сумленна служыў людзям і Айчыне», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка і мітрапаліт Веніямін усклалі да манумента белыя ружы, любімыя кветкі мітрапаліта Філарэта. Пасля адкрыцця помніка яны наведалі храм, дзе запалілі свечкі каля Распяцця. Уладыка ўручыў у падарунак кіраўніку дзяржавы ікону з асабістага збору мітрапаліта Філарэта ў памяць аб ім.

«Галоўная наша задача — каб справа ўладыкі мітрапаліта Філарэта працягвалася, пашыралася», — сказаў мітрапаліт Веніямін.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота БелТА.

### ВАРТЫ ТАГО, КАБ ЗАЎСЁДЫ ПАМЯТАЛІ

У саборы Аляксандр Лукашэнка коратка паразмаўляў са свяшчэннаслужыцелямі, сярод якіх быў унучаты пляменнік мітрапаліта Філарэта. Протаіерэй Георгій Вахрамееў, настаяцель маскоўскага храма Жыватачынальнай Тройцы на Шабалаўцы, крыху расказаў журналістам пра свайго родзіча.

«Падзяка Прэзідэнту за тое, што мы сёння змаглі ўдзельнічаць у адкрыцці помніка нашаму роднаму дзядзечку. Я сёння прыехаў сюды са сваімі пляменнікамі, нашы дзеці і нашы ўнукі і сёння ўсе з намі. У свята Радаўніцы мы ўспамінаем пра ўсіх сваякоў, але пра такога сваяка хочацца шмат гаварыць, успамінаць і расказваць. Гэта сапраўды герой, і ён стаў героем натуральным шляхам», — сказаў ён.

Карані мітрапаліта Філарэта з Яраслаўля, і аднойчы ён сказаў родным, што стаў беларусам. Па словах унучатага пляменніка, гэта было сказана дастаткова моцна і шчыра.

«У цяжкія гады ён прыйшоў і прынёс дух сапраўднай праваслаўнай веры, якая нічога не баіцца. І ён вельмі ўмела і таленавіта размаўляў з тагачаснай цывільнай уладай, гэта выклікала здзіўленне ва ўсіх, хто з ім сустракаўся. Ён дабіваўся дзівосных поспехаў. У нашай сям'і гэта святы чалавек. Ён быў просты са сваёй сям'ёй, спакойна сядзеў з бабуляй, дзядулем, і я заўсёды стараўся быць на такіх сустрэчах у яго доме. Вельмі шмат успамінаў аб ім. Гэты чалавек варты таго, каб пра яго заўсёды памяталі. Царква, вядома, памятае. Вечны спакой — гэта калі чалавека вечна памятаюць. І калі людзі яго памятаюць, значыць, у яго будзе вечны спакой, там, куды ён і імкнуўся і куды імкнецца кожны хрысціянін», — падзяліўся протаіерэй Георгій Вахрамееў.

Ён расказаў, што Філарэт умеў прымірыць непрымірымае, стварыць атмасферу дабрыні і разумення. Свецкія ўлады перад ім нават крыху губляліся, калі ён з дабрынёй і ўнутранай добразычлівасцю гаварыў аб праблемах царквы. Ён абяззбройваў людзей, якія хацелі б канфрантацыі, а пасля кантакту з ім выходзіла наадварот.

«Унікальны ў гісторыі прыклад, калі кіраўнікі царквы і дзяржавы былі ў такім кантакце. Гэта вялізная радасць. Што б ні адбывалася ў сучасным свеце, Расія і Беларусь — мы браты, мы любім адно аднаго першапачаткова, у нас адна вера і адна маральная ўстаноўка ў жыцці. Таму мы пераможам. Перамога будзе за намі», — падкрэсліў маскоўскі святар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# Другое жыццё Одзі. Шчаслівае

## Сабаку на відэа жорстка збівалі. У сітуацыю ўмяшаўся Прэзідэнт

На відэа з Віцебска, якое ў канцы красавіка распаўсюдзілася ў інтэрнэце, нармальны чалавек спакойна глядзець не зможа. Жанчына, ведучы на павадку невялікага белага сабачку, злосна некалькі разоў футболіць яго нагой, так, што бедная жывёлка адлятае на некалькі метраў. Гэты жудасны выпадак абурыў грамадскасць. Спачатку ўмяшалася віцебская міліцыя, жанчыну затрымалі. Пасля відэа ўбачыў Прэзідэнт і таксама не пакінуў яго без увагі. «Для мяне непрымальныя і недапушчальныя тры рэчы: плач дзяцей, гвалт жанчын, забойства жывёл», — нядаўна дзяліўся ён. Таму нядзіўна, што ў гэтай сітуацыі кіраўнік дзяржавы палічыў за патрэбнае ўмяшацца.



Одзі з новым гаспадаром.

Фота БелТА.

Высветлілася, што гаспадыня сабакі разведзеная, дзяцей няма. Раней была неаднаразова судзімая. У 2015 годзе яе за хуліганства прыгаварылі да пяці гадоў абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову, у 2017-м за ўхіленне ад адбывання пакарання яе асудзілі на паўтара года пазбаўлення волі. Гэтым разам жанчыну хочуць прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці за жорсткае абыходжанне з жывёламі, непадпарадкаванне міліцыі. Да суду яна змешчана ў ізалятар часовага ўтрымання. Сваякі жанчыны сваёй біяграфіяй ёй не саступаюць, таму сабачка апынуўся ў прытулку.

Гаспадыня падпісала адмову ад сабакі. Шчаня прывезлі ў Мінск, і 2 мая ў фінале хакейнай трэніроўкі Прэзідэнт падарыў яго трэнеру сваёй каманды, сенатару Дзмітрыю Баскаву.

Аказалася, сабачка — шчанюк узростам год і тры месяцы. Одзі — так завуць малога, вельмі кампанейскі, сямейны і любіць дзяцей.

Дарэчы, у краіне распрацоўваецца закон аб абароне жывёл. Яшчэ ў студзені Аляксандр Лукашэнка ў час Паслання беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу падтрымаў распрацоўку законапраекта. Гэтую тэму перад Прэзідэнтам актуалізавала дэпутат Марыя Васілевіч.

«Абсалютна згодны з тым, што нарматыўных актаў, якія ў нас ёсць, недастаткова, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Таму, калі дэпутаты распрацуюць адпаведны законапраект і збяруць найлепшае ў свеце, у тым ліку расійскае, я гатовы да гэтага падключыцца і садзейнічаць прыняццю дакумента па-за тым планам, які зацверджаны Прэзідэнтам, і прыводзіць яго ў жыццё».

**Паводле БелТА.**

# ПАДАЦЬ ЗАЯВУ НА ЦТ МОЖНА АНЛАЙН

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*



Спачатку трэба ўвесці свае даныя (серыю і нумар дакумента, які сведчыць асобу, мабільны нумар тэлефона). Затым абітурыенту прыйдзе SMS з паролем да асабістага кабінета. Ён фарміруецца ў момант першага ўваходу. У наступныя разы трэба будзе толькі ўвесці лагін і пароль.

Далей у сістэме неабходна выбраць прадметы, пункты тэсціравання і іншыя даныя. Наступны этап — аплата за ўдзел у ЦТ праз сістэму АРІП. Правесці аплату трэба не пазней за 1 чэрвеня, выкарыстоўваючы нумар свайго асабовага рахунку, указанага ў асабістым кабінеце сістэмы рэгістрацыі. Гэта сума складае 0,1 базавай велічыні за адзін вучэбны прадмет (3,2 рубля). У кошт закладваюцца выдаткі на работу пунктаў рэгістрацыі, афармленне дакументаў і правядзенне экзамену.

Выбар мовы, на якой абітурыент жадае здаваць тэсты, ажыццяўляецца яшчэ на этапе падачы заявы і рэгістрацыі на ЦТ. Заява запаўняецца ўдзельнікам ЦТ на адной з дзвюх дзяржаўных моў: беларускай ці рускай на выбар. Трэба мець на ўвазе, што пазней зона рэгістрацыі бланка адказаў будзе запаўняцца абітурыентам на той жа мове, на якой была пададзена заява пры рэгістрацыі. І сертыфікат удзельніка ЦТ будзе запаўняцца таксама на той мове, на якой падавалася заява.

Абітурыентам трэба мець на ўвазе, што папярэдняя рэгістрацыя будзе даступная да 12 гадзін 1 чэрвеня. А ў апошні дзень пасля 12 гадзін і да закрыцця пунктаў рэгістрацыі падаць заяву на ўдзел у ЦТ можна будзе толькі асабіста.

— Рэгістрацыя завяршаецца атрыманнем пропускаў, па якія трэба звярнуцца асабіста не пазней за 1 чэрвеня, — падкрэслівае **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК**. — У графе «Абраныя прадметы і пункты тэсціравання» будуць указаны адрасы пунктаў рэгістрацыі (іх 41). У адзін з іх неабходна будзе завітаць з пашпартам, ID-карткай, пасведчаннем на жыхарства або пасведчаннем бежанца. Забраць пропускі замест абітурыента могуць таксама яго законныя прадстаўнікі. Менавіта ў пропуску ўказваецца інфармацыя, калі і куды трэба прыходзіць у дзень правядзення тэсціравання. Без пропускаў на тэсціраванне не пусцяць, аднаго толькі факта падачы электроннай заявы недастаткова.

Абітурыентам трэба быць уважлівымі: пропуск для ўдзелу ў ЦТ лічыцца зарэгістраваным, калі на ім ёсць пячатка ўстановы, вызначанай пунктам рэгістрацыі на ЦТ, подпіс упаўнаважанага прадстаўніка пункта рэгістрацыі і ўказаны рэгістрацыйны нумар. У выпадку страты пропуску выдаецца дублікат.

Пакуль абітурыент не атрымаў пропуск, у асабістым кабінеце можна змяніць даныя ў заяве: набор прадметаў, мову тэста і г. д. Калі з'явіцца неабходнасць гэта зрабіць пасля атрымання пропуску, трэба будзе звяртацца ў пункт ЦТ асабіста. Адпаведна, калі ты рэгістраваўся афлайн, то і змены ўносяцца ў тым пункце, дзе ты пісаў заяву. Аднак усе маніпуляцыі магчымыя толькі да 1 чэрвеня (уключна).

Калі абітурыент жадае запісацца на ЦТ афлайн, ён (або яго законны прадстаўнік) можа звярнуцца ў адзін з 41 пунктаў рэгістрацыі. Аднак у любы час гэта зрабіць немагчыма. У мэтах недапушчэння масавага збору людзей пункты рэгістрацыі арганізуюць папярэдні запіс (фарміруюць электронную чаргу), што дасць магчымасць вызначыць дату і час наведвання абітурыентамі пунктаў рэгістрацыі. У сувязі з гэтым перад наведваннем пункта рэгістрацыі неабходна азнаёміцца з інфармацыяй на яго сайце. Адрасы, тэлефоны, графік работы пунктаў рэгістрацыі размешчаны на сайце Рэспубліканскга інстытута кантролю ведаў у раздзеле «Пункты рэгістрацыі і правядзення ЦТ». Пры сабе абавязкова трэба мець дакумент, які сведчыць асобу, і грошы для аплаты тэсціравання.

У кожным з пунктаў рэгістрацыі абітурыент можна запісацца ў любую ВНУ, дзе яму будзе больш зручна здаваць экзамен. Усё таму, што сістэма рэгістрацыі аўтаматызаваная. Напрыклад, прыйшоўшы ў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт, можна падаць заяўку на здачу ЦТ у Мінску, Магілёве, Гомелі, Брэсце, Віцебску і г. д. І зусім неабавязкова пісаць тэсціраванне ў той ВНУ, куды абітурыент збіраецца паступаць. Лепш выбраць месца бліжэй да дома, каб пазбегнуць непрадбачаных сітуацый (спазнення транспарту, забытых дакументаў і г. д.).

Абітурыенты са шматдзетных сем'яў здаюць ЦТ бясплатна. Ім трэба прынесці даведку аб месцы жыхарства і складзе сям'і і іх ксеракопіі. Таксама бясплатна рэгіструюцца на тэсціраванне сіроты, інваліды I і II груп, абітурыенты, чые бацькі сталі інвалідамі на ваеннай службе. Падрабязнасці можна даведацца ў 12-м пункце Палажэння аб правядзенні ЦТ.

Абітурыенты, з якіх не спаганяецца плата за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ, не могуць падаць заяўку анлайн. Зрабіць гэта трэба асабіста або праз законнага прадстаўніка.

Абітурыентам дазваляецца зарэгістравацца не больш як на чатыры дысцыпліны. Такім чынам, у іх ёсць магчымасць ракіроўкі пры паступленні на роднасныя спецыяльнасці. Па вопыце папярэдніх гадоў прыкладна палова абітурыентаў выбірае чацвёрты рэзервовы прадмет.

Замежнікі могуць зарэгістравацца на ЦТ любым з вышэйпералічаных спосабаў. Калі няма магчымасці аплаціць удзел у ЦТ і атрымаць пропускі да 1 чэрвеня, то можна прайсці рэгістрацыю пасля прыбыцця ў Беларусь. Трэба будзе звярнуцца ў пункт рэгістрацыі не пазней чым за адзін дзень да пачатку тэсціравання, атрымаць асабовы рахунак, унесці плату за прыём і афармленне дакументаў праз сістэму «Разлік» (АРІП), выкарыстоўваючы нумар асабовага рахунку, атрыманага ў пункце рэгістрацыі. Пры сабе, вядома, трэба мець пашпарт.

Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе ў Беларусі 14 чэрвеня. У гэты дзень абітурыенты здаюць ЦТ па беларускай мове. Самымі масавымі выпрабаваннямі традыцыйна будуць ЦТ па матэматыцы і рускай мове. Пад іх правядзенне «забраніравана» па два дні. 16 і 17 чэрвеня абітурыенты здаюць рускую мову, 19 чэрвеня — грамадазнаўства, 21 і 22 чэрвеня — матэматыку, 24 чэрвеня — біялогію, 26 чэрвеня — замежную мову, 28 чэрвеня — хімію, 30 чэрвеня — фізіку, 2 ліпеня — гісторыю Беларусі, 4 ліпеня — геаграфію і 6 ліпеня — сусветную гісторыю найноўшага часу.

Для тых, хто прапусціў ЦТ па ўважлівай прычыне, прадугледжаны тры рэзервовыя дні. Зарэгістравацца для здачы ЦТ у дадатковыя дні можна будзе з 2 да 7 ліпеня. Але для таго, каб быць дапушчанымі да экзамену, давядзецца дакументальна пацвердзіць, што прычына пропуску была насамрэч уважлівая.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

## САЮЗНАЯ ЦІКАЎНАСЦЬ ДА ЛІТАРАТУРНЫХ СТАСУНКАЎ

**На рабочай сустрэчы з Дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Дзмітрыем Мезенцавым старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр Карлюкевіч выклаў шэраг прапаноў па развіцці сумесных намаганняў у галіне кнігавыдання на ваенна-патрыятычную тэматыку.**

Размова ішла пра выданні, якія будуць падтрыманы Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы ў найбліжэйшы час — 2022—2023 годзе. У прыватнасці, завяршаецца творчы кніжны праект, прысвечаны гераічным дзеянням партызан Беларусі і Расіі. Запланавана да выдання на рускай і беларускай мовах кніга беларускага паэта, празаіка, грамадскага дзеяча Кастуся Кірэенкі, які прайшоў дарогамі Вялікай Айчыннай вайны, быў ваенным карэспандэнтам.

Мяркуецца, што шмат шырэй будзе выкарыстаны патэнцыял беларускай пісьменніцкай сябрыны ў стварэнні гераіка-патрыятычнай літаратуры. Дзмітрый Мезенцаў як нашчадак франтавіка, ваеннага журналіста, які ў складзе войск 1-га Беларускага фронту вызваляў Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, звярнуў увагу на неабходнасць болей шырокага асэнсавання тэмы генацыду, варварскіх дзеянняў фашыстаў на акупаваных тэрыторыях Беларусі і Расіі. Дзяржсакратар выказаў упэўненасць, што гэтая тэма стане прадметам болей шырокай зацікаўленасці беларускіх і расійскіх пісьменнікаў, найперш — публіцыстаў.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Па сутнасці

# УРОКІ ГІСТОРЫІ



Яны ўсё старанна падлічылі. Па-заходняму. Педантычна. Да стэрыльнага знішчэння славянскіх «свінняў» — гэта план «Ост». Да жудаснай рэчаіснасці ваенных дзеянняў згодна з «Барбаросай». Але адсыл да кіраўніка, пры якім Свяшчэнная рымская імперыя дасягнула найвялікшага росквіту, не дапамог. Сяляне беларускага Палесся, шахцёры Данбаса і слесары ўральскіх заводаў не чыталі ні пра Барбаросу, ні пра арыйскую ўнікальнасць. Яны бачылі папялішчы, забітых дзяцей, замучаных старых і памерлых ад згвалтавання дзяўчат. А яшчэ яны любілі мір, таму з такой жа сілай, як сякеру ці касу, трымалі ў руках зброю. Еўрапейцы «дзікуноў-славян» хацелі загнаць за ўральскі хрыбет. Менавіта гэтыя «дзікуны-славяне» і зламалі нацысцкі хрыбет нашчадкам «рыцараў». Гвалтаваць, забіваць і рабаваць — вось высакародныя заняткі германцаў і англасаксаў. Некалі яны гэта рабілі, прыкрываючыся сцягамі Хрыста, потым тэорыямі чысціні нацый. Ці не ідэолагі белай каланізацыі Афрыкі і экспансіі канкістадорамі індзейцаў Амерыкі падсунулі знаўцу венскага жывапісу замест мальберта расавую тэорыю...

А не здаецца вам, паважаныя славяне, што брусельскія і вашынгтонскія пасяджэнні вельмі ж нагадваюць крывавыя пасяджэлкі ў гітлераўскіх бункерах? Тая ж «эўрапэйская» ганарыстасць, тыя ж пагардлівыя ўсмешкі, калі гаворка ідзе пра нас з вамі. І нават інтэр'ер пануры, нібы адлюстроўвае думкі і душы палітычнага істэблішменту захоўняга свету. У гэтых дэкарацыях можна здымаць фільмы жахаў, напрыклад стаўку інфернальных сіл. І ў гэтых дэкарацыях прымаюць рашэнні бамбіць, бамбіць, бамбіць. Югаславію, Лівію, Сірыю, Афганістан, Ірак, Іран... Тут жа вырашаюць, як дзяўбці, дзяўбці, дзяўбці. Мінск, Маскву, Пекін.

Захад абстрэльвае Беларусь санкцыямі, нібыта калісьці Брэсцкую крэпасць — нацысты. Цвярдыня над Бугам трымалася амаль месяц. Мы не трымаемся — мы жывём пад гэтымі санкцыямі яшчэ з мінулага стагоддзя. Напэўна, адразу пасля таго, як Сорас вярнуўся з Беларусі ні з чым. Канешне, мы маглі б выбраць шлях Польшчы. Пра яе Ленін трапна сказаў. Мы — іншыя. Мы не пагадзіліся за гуманітарныя мільёны лізаць ножкі Буша, не пагадзіліся ставіць амерыканскія базы і лаўкі Клінтана ў Курапатах. Чаму? Каб зразумець, схадзіце на магілкі да сваіх продкаў — салдат Перамогі. Радаўніца скончылася. Але яшчэ не позна.

Мы нават... Ну як мы? Смелыя, разумныя, нярэдка непапулярныя рашэнні тады прымаў Прэзідэнт. Па-першае, мы зберагалі айчынную вытворчасць, па-другое, пачалі яе развіваць. Пачыналі са шклення заводскіх цэхаў. А скончылі касмічнымі тэхналогіямі, космасам у АПК і медыцыне. Не, не ўсё ўмеем. Але ж маем свае кампетэнцыі. А колькі разоў нас пераконвалі таўстасумы з МВФ: знішчыце тое, прыватызуйце сёе (лічы, тое ж самае, што знішчыць) у абмен на кабалу. Прабачце. Даларызацыю — экспансію зялёных купюр у фінансавай сістэме краіны. А яшчэ тутэйшыя «эксперты», накшталт літаратурнага Знасілоўскага, лямантавалі: навошта МАЗ, БелАЗ, «Інтэграл» альбо МЗКТ?! Пагадзіліся! На джондзярах да малочнай супердзяржавы не дабраліся.

І калі лібералы суседняй Расіі адварочваліся ад беларускай каўбасы і сыроў. Ну як лібералы. Толькі заўсёднікі еўраамерыканскіх фуршэтаў ды працаўнікі свецкіх раўтаў. Звычайны сапраўдны рускі чалавек заўжды выбіраў малако з Магілёва, а сыр — з Брэста. Бо з Еўропы яму везлі хімічную атруту замест стравы. Хамон ці фуа-гра — гэта для тых, хто за ежу нават бацькаўшчыну гатоў прадаць. Гэтыя клікуны спачатку заклікалі адмовіцца ад Беларусі. Арыенцір — Еўропа і Захад. А калі ў Мінск пачалі запрашаць партнёраў па тавараабароце, то гэтыя ж самыя клікуны абвінавачвалі нас у здрадзе — шматвектарнасці. Разумею. Каб пасварыць братоў.

Толькі Беларусь і беларусы ніколі не здрадзілі рускім. Наадварот, здаецца, мы лепш любім Расію, чым тая ліберальная суполка з балотнай. Яны толькі любяць грошы і прайм-тайм. Я памятаю, як казаў Анатоль Ярмоленка з «Сяброў»: «Грошы трэба зарабляць дзе заўгодна, а траціць іх — дома». У клікуноў з маскоўскіх офісаў наадварот: грошы выпампоўваюць з матухны Расіі, а потым раскідваюцца імі па ўсім свеце.

За кубачак Mount Hagen на вуліцы Ру-Нэвэ яны гатовы прадаць адразу і памяць пра Аляксандра Неўскага, Дзмітрыя Данскога, Мініна і Пажарскага, Ягорава і Кантарыю. Яны гатовы прадаць і сучасныя перамогі сваіх вайскоўцаў. Не атрымаецца.

Браты, не хвалюйцеся. Беларусь, якую лібералы крытыкавалі за падтрымку Крамлём, крэдытная рэсурсы ўклала ў развіццё прамысловых і навуковых кампетэнцый. А таму мы разам з вамі зможам зрабіць шмат чаго добрага. Цікава атрымліваецца: без Захаду мы выйшлі ў космас і пабудавалі БАМ. А з партнёрамі пераправалі свае заводы ў пляцоўкі для іх тавараў, а інжынерныя бюро — у офісы для замежных фондаў. І, дарэчы, чаму тыя самыя эксперты не падлічаць, колькі народных грошай і багацця алігархі звезлі ў Еўропу.

І колькі б ні шыпелі еўрапейскія функцыянеры «sanctions», наш дырэктарыят вельмі трапна навучыўся вымаўляць «дыверсіфікацыю экспарту». А цяпер яшчэ нас чакае адначасова самы блізкі і вялікі рынак. Шматтонныя залпы трапілу змяніліся на дывановыя бамбардзіроўкі санкцыямі. Сотні ядзерных ракет стрымліваюць нашчадкаў каланізатараў рухацца «нах остэн». Дзеля гэтага ёсць рабы з Галічыны і Валыні. Прабачце, на іх мове гучыць як рабкі. Ну, і застаецца бамбіць фінансава. Зноў і зноў у палітычных бункерах калектыўнага Захаду гучыць «sanctions». Так было заўжды. Але ў якіх бы цяжкіх даспехах яны па-свінску ні ішлі да нас, іх шлях заканчваўся на дне Чудскога возера, а пад Грунвальдам, ці ў бункерах рэйхстага — капітуляцыяй. Перад тым як гарлапаніць «sanctions», навучыцеся без акцэнту гаварыць: «КАПІТУЛЯЦЫЯ».

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# «З ПАВЕДАМЛЕННЯЎ У «ІНСТАГРАМ» ВЫЯЎЛЯЮ СІСТЭМНЫЯ ПРАБЛЕМЫ РАЁНА»



**Крыху больш за год таму ў аднаго з самых перспектыўных раёнаў Мінскай вобласці — Дзяржынскага — з'явіўся новы старшыня Максім ЛЫСЕНКА. Маладому кіраўніку паставілі задачу — надаць краю новае дыханне. І ён з усёй душой заняўся гэтай работай. А як іначай? Малая радзіма! Максім Уладзіміравіч завёў «Інстаграм», каб быць бліжэй да людзей, наладзіў адносіны з мясцовым бізнесам і прыцягнуў іх да добраўпарадкавання раёна, абнавіў райвыканкам маладымі творчымі кадрамі. Ад чаго яшчэ гараць вочы старшыні Дзяржынскага райвыканкама Максіма Лысенкі і што супраць гэтага мае яго жонка — у новым інтэрв'ю рубрыкі «Плеяда маладых».**

***— Сярод невялікай колькасці інфармацыі пра вас у інтэрнэце знайшла цікавы факт, што нарадзіліся ў Казахстане. Як там апынуліся вашы бацькі?***

— Я нарадзіўся ў горадзе Кастанай на поўначы Казахстана — гэта так званая цаліна. У 18 гадоў маладым будаўніком туды пераехаў з Дзяржынскага раёна мой дзядуля. Там сустрэў маю бабулю. Яна была з Украіны, таксама асвойвала цаліну. Таму мая маці нарадзілася ў Кастанаі. У таты падобная гісторыя.

***— А калі ваша сям'я пераехала ў Беларусь?***

— Кастанай быў шматнацыянальным рэгіёнам Казахстана, дзе жылі людзі з усяго Савецкага Саюза. У канцы 1990-х гадоў з'явіліся ў краіне тэндэнцыі да нацыяналізму. Прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў пачалі з'язджаць на радзіму. Першым з маёй сям'і па закліку сэрца прыехаў у Беларусь дзядуля. Калі стала пытанне ў маёй сям'і: заставацца ці не, бацька прыняў рашэнне на карысць пераезду. Людзі, якія падымалі цаліну, звыклыя да працы, калектывізму. У Беларусі былі ўсе магчымасці, каб атрымаць адукацыю, жыць у спакойнай краіне.

***— Колькі вам было гадоў, калі пераехалі?***

— Каля 15 гадоў. Тут, у Дзяржынскім раёне, я скончыў 10-11 класы школы. І паступіў ва ўніверсітэт у Мінску.

***— Пра ўніверсітэт: ваша спецыяльнасць па першай вышэйшай адукацыі — «Лясная гаспадарка». Чаму вас зацікавіла гэта сфера?***

— З дзяцінства ў мяне было два захапленні: кнігі і жывёлы. Вельмі люблю чытаць класічную мастацкую літаратуру і зараз. Зразумела, што бібліятэкарам мужчыну быць не вельмі трапна, таму спыніўся на лясной гаспадарцы. Будучая прафесія была звязана з прыродай, яе аховай, аднаўленнем лесу.

**«Калектыў неабходна амалоджваць, каб былі новыя ідэі і людзі не баяліся іх выказваць».**

***— Колькі вы працавалі ў прыродаахоўных службах?***

— У сістэме Мінпрыроды працаваў каля 14 гадоў. Вельмі любіў сваю работу, бо яна шматгранная. Нямногія ведаюць, чым займаюцца ахоўнікі прыроды, таму недаацэньваюць гэтую службу. Экалогія — гэта ўсё, што звязана з зямлёй, яе захаваннем ад забруджвання, з паветрам, выкідам шкодных рэчываў, воднымі рэсурсамі, свідравінамі, вадаёмамі, раслінным і жывёльным светам. Усё гэта праходзіць праз інспекцыю прыродных рэсурсаў і знаходзіцца пад яе кантролем.

***— Як да вас паступіла прапанова ўзначаліць Дзяржынскі райвыканкам?***

— Гэта было вельмі нечакана. Працаваў я начальнікам у Мінскім абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Аднойчы мяне да сябе запрасіў Аляксандр Генрыхавіч Турчын, губернатар Міншчыны, і прапанаваў пайсці працаваць у раён. Ён адзначыў, што я ўжо меў вопыт працы там, ведаў кіраўнікоў, рэгіён і падкрэсліў, што Дзяржыншчыне неабходны новы штуршок для развіцця. Я чалавек дзяржаўны. Калі неабходны на нейкім участку працы — буду там.

***— Ці здараліся цяжкасці на новай пасадзе?***

— Работа з кадрамі заўсёды няпростая. Адна з асноўных маіх задач была — правільна расставіць кадры, каб разглядзець, з кім я гатовы працаваць. Я вельмі патрабавальны да людзей у плане дысцыпліны. Год таму з маім прыходам у райвыканкам нагрузка на падначаленых дадалася. Плюс лічу, што калектыў неабходна амалоджваць, каб былі новыя ідэі, і людзі не баяліся іх выказваць. Мы часта збіраемся і ладзім «мазгавыя штурмы». Гэта для калектыву было спачатку нязвыкла, але я хацеў зразумець, што ў галовах маіх падначаленых. Ва ўладзе павінен прысутнічаць нестандартны, творчы падыход да працы. І, безумоўна, выканаўчая дысцыпліна.

***— Як ідзе амаладжэнне? Чым удаецца «зацягнуць» маладыя кадры ў рэгіён?***

— Зразумела, немалаважныя заробкі. У Дзяржынскім раёне яны дастаткова высокія. Сярэдні — каля 1600 рублёў, а па шэрагу прадпрыемстваў можа даходзіць да трох-чатырох тысяч. Будуюцца новыя дамы, даём арэнднае жыллё. Што яшчэ неабходна маладым спецыялістам? Каб яны раскрывалі свой патэнцыял! Я даю ім такую магчымасць, не заганяю ў рамкі. І моладзь прыходзіць да мяне, нават з Мінска. Новыя кадры гатовыя ісці са мной і ў агонь, і ў ваду. З імі часам прымаем нестандартныя рашэнні, не па звыклых правілах. Але пераможцаў не асуджаюць, бо мы, не парушаючы закон, робім лепш для насельніцтва.

***— Дзяржынскі раён сёння — адзін з самых дынамічных у сталічным рэгіёне, а то і ў краіне. За кошт чаго дабіліся такога звання?***

— Будзем шчырымі: шмат дапамагло геаграфічнае размяшчэнне побач з Мінскам. Сорак хвілін — і ты ў цэнтры сталіцы. Праз нас праходзяць важныя дарогі (М1, Р1, другая МКАД) і чыгунка. Ёсць магчымасці для адкрыцця вытворчасцяў і спецыялісты для іх. Ва ўсіх населеных пунктах забяспечана неабходная інфраструктура. Калі ласка, інвестары, развівайце! Будзе вам неабходна зямля — вось зямля, неабходныя людзі — вось людзі. Да таго ж у нас растуць дэмаграфічныя паказчыкі. А колькі ў невялікіх вёсачках непрапісаных яшчэ пражывае. Вельмі развітая ў нас і сельская гаспадарка. Гэта, праўда, не мая заслуга, не прыпісваю сабе. Але АПК на высокім узроўні. А хто гэта ўсё робіць? Людзі, спецыялісты. Дэмаграфічнае размяшчэнне плюс кадры — і ўсё складваецца. Мы будуем пастаянна жыллё, ствараем працоўныя месцы, таму да нас з усёй краіны едуць маладыя сем'і.

***— Вы адзначаеце, што на Дзяржыншчыне шмат вытворчасцяў. Ці адчулі яны на сабе ўплыў крызісу? Як удаецца спраўляцца з санкцыямі?***

— Я сам вельмі турбаваўся наконт іх. Думаў, як цяжка будзе прадпрыемствам, адпаведна, і паступленні ў бюджэт зменшацца. А бюджэт — гэта ўся сацыялка рэгіёна: ахова здароўя, адукацыя, ЖКГ. Таму ўсе планы на 2022 год, меркаваў, рэалізаваць не зможам. Але кіраўнікі прадпрыемстваў усе да аднаго мне сказалі: «Уладзіміравіч, не турбуйся, мы справімся». Яны мяне супакоілі, хоць павінна было быць наадварот. Больш за тое, прадпрымальнікі Дзяржынскага раёна, акрамя таго, што даюць унёсак у бюджэт, дапамагаюць у добраўпарадкаванні горада. Праблемы, наадварот, больш нас аб'ядналі — уладу і бізнес.



З сынам Арсеніем.

***— Якімі якасцямі павінен валодаць малады кіраўнік?***

— У першую чаргу быць усебакова развітым, адукаваным, дысцыплінаваным. У маім выпадку кіраўнік раённай улады — адкрытым да людзей. Калі я прыйшоў на службу, сабраў сваіх супрацоўнікаў і сказаў: «Вы не беладомаўскія». Я ім падкрэсліў, што мы ўсе служым людзям. Не варта задзіраць насы, завязаўшы гальштукі, зачыняцца ў кабінетах і лічыць сябе вялікімі чыноўнікамі. Тым, хто так працуе, я адразу сказаў шукаць іншае месца. Нам неабходна сустракацца з людзьмі, размаўляць. Часта бывае, што прыёмы грамадзян выцягваюць энергію, быццам некаторыя прыходзяць спецыяльна, каб з раўнавагі вывесці. Але ў большасці людзі ў нас добрыя, любяць сваю краіну, дзесьці ім толькі трэба дапамагчы. І яшчэ кіраўнік павінен любіць тое, што робіць. Днямі вырашыў жонцы паказаць, што зроблена ў горадзе, што плануецца. Едзем, я ёй расказваю, паказваю, а яна на мяне глядзіць незадаволена. Пытаюся, чаму. Адказвае: «Ты б бачыў, як у цябе вочы гараць. Чаму яны ў цябе так неззяюць дома, калі ты займаешся сваім участкам?!»

***— Пагаворым пра ваш «Інстаграм». Там вы размяшчаеце падзеі з уласнага жыцця і з жыцця раёна. Хто вядзе акаўнт?***

— Я самастойна ім займаюся, дапамагаюць часам за зборам матэрыялаў. Звычайна на работу прыязджаю ў сем гадзін раніцы, хоць працоўны дзень пачынаецца толькі ў 8.30. Адразу 40 хвілін аддаю «Інстаграму». У дырэкце гляджу паведамленні. Часам лістоў бывае да 40, таму некаторыя магу адкрыць толькі праз тыдзень. Каму ведаю, што адказаць, адразу пішу. Калі не дасведчаны пра нешта, раблю нататкі, каб пазней разабрацца з сітуацыяй. Вечарам я ўвогуле адключаю інтэрнэт. Бывае, прачытаеш на ноч непрыемнае паведамленне — спаць немагчыма. Я ўсё вельмі блізка да сэрца прымаю.

Цікавыя ў нас людзі! Напрыклад, скінуў пост пра рамонт дарогі, будаўніцтва ФАК — пайшоў адзін негатыў ад падпісчыкаў. А калі закіну прыгожую фатаграфію з маці, то будзе тысяча «лайкаў». Часам на непаважлівыя і грубыя выказванні адказваю падобным чынам — стаўлю грубіянаў на месца. Але «Інстаграм» і звесткі ад людзей мне вельмі дапамагаюць. Калі праводжу планёркі, то ад маёй інфармаванасці ў падначаленых мову адымае: «Адкуль старшыня пра гэта ведае?» З паведамленняў у «Інстаграм» выяўляю сістэмныя праблемы раёна. У нас за мінулы год знізілася колькасць пісьмовых зваротаў грамадзян. Звязваю гэта з работай у «Інстаграме». Да таго ж прымусіў ЖКГ, аўтапарк завесці тэлеграм-каналы ці старонкі ў сацсетках. Гэта была вымушаная мера, каб наладзіць сувязь з людзьмі. Яны мае бясплатныя інфарматары.

***— Што больш за ўсё падабаецца ў вашай рабоце?***

— Я бачу вынік сваёй дзейнасці. У экалогіі не было відавочнасці маёй работы. А тут усё дакладна відаць — і атрымліваеш ад гэтага задавальненне. Амаль што кожны вечар я аб'язджаю па квадратах раён і гляджу, як выконваюцца мае даручэнні. Калі нехта недапрацоўвае, назаўтра ў маім кабінеце разбіраемся, чаго не хапае: жадання, дысцыпліны, людзей ці грошай.

**«Праблемы, наадварот, больш нас аб'ядналі — уладу і бізнес».**

***— Вы жывяце, як я ведаю, у вёсцы, дзе ў вас уласны дом. Якія перавагі жыцця за горадам?***

— Дом значна адрозніваецца ад кватэры. У кватэру ты прыйшоў з работы, паеў і — на канапу каля тэлевізара. Свая сядзіба дысцыплінуе. Ты ведаеш, што пасля работы табе неабходна будзе яшчэ апрацаваць расліны, скасіць газон, дах падлатаць. То-бок ты не адпачываеш, а пачынаеш зноў працаваць. Часам зрываешся, кажаш: «Ды ну яго!» А потым зноў бярэшся за работу. Я вельмі люблю жывёл. Пакуль у мяне толькі сабакі, але іх тры. Кур жонку не ўгаварыў завесці. Дома ўсё раблю сам. Калі будавалі дом, наймалі людзей. Потым крэдыт скончыўся, а дом не дабудавалі... І сам пачаў гэтым займацца. Самастойна з жонкай і сынам летась пабудавалі альтанку. Ды сёння ў тым жа YouTube можна паглядзець, як усё робіцца.

***— Гародніну высаджваеце ў сезон?***

— Так. Вырошчваем клубніцы, зяляніну, агуркі, памідоры. Пасадзілі сад. Яшчэ і маці дапамагаем. У яе і бульба, і гарбузы, і кабачкі, і перцы. Думалі, што нічым займацца не будзем. Потым жонка папрасіла зрабіць адну градку. Засадзілі. Кажа: «Мала. Давай другую». І так у мінулым годзе пачалі з адной градкі, да канца вясны ў нас ужо быў цэлы агарод.

***— У вёсцы, вядома, паміж суседзямі блізкія адносіны. Як яны рэагуюць, што іх сусед — кіраўнік раёна?***

— Вяскоўцы ведалі мяне яшчэ да пасады старшыні раёна. Зараз я для многіх стаў Уладзіміравіч, а раней быў проста Максім. Я ніколі не афішыраваў асабліва, кім у Мінску працую. Ды яны ведаюць маю пазіцыю наконт добраўпарадкавання нашай вёскі: ёсць шмат пасёлкаў, дзе сітуацыя горшая, чым у нас. Таму ў першую чаргу пачынаем з іх. Увогуле, добра мы кантактуем з суседзямі. Амаль нічога не змянілася, толькі яны больш саромецца сталі.

***— Якія сёння ставіце для сябе мэты ў прафесіі і ва ўласным жыцці?***

— Я хачу максімальна больш паспець зрабіць для раёна. Што датычыцца сям'і, задача тая ж — зрабіць больш. Мне дома кажуць, што час, які я праводжу на рабоце, забіраю ў сваёй сям'і, упускаю перыяды, важныя для нас, але ўсё роўна не магу з сабою нічога зрабіць. Пры гэтым у мяне няма кар'ерных амбіцый. Я да гэтага проста стаўлюся. Калі з важнай пасады накіруюць у калгас — пайду без разваг. Што, у калгасе няма чым займацца? Там таксама шмат магчымасцяў для росту.

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота з «Інстаграма» героя і сайта Дзяржынскага райвыканкама**

# Гэта патрэбна жывым

## Пра новыя факты маштабнага расследавання, пошукавыя работы, захаванне праўды і памяці аб Вялікай Айчыннай вайне

**Генеральная пракуратура працягвае расследаванне крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд. За год, які прайшоў з моманту распачынання працэсу, дапытана больш чым 14 тысяч чалавек, выяўлена 12 невядомых дагэтуль месцаў знішчэння мірных жыхароў, атрыманы звесткі аб спаленых акупантамі і іх памагатымі яшчэ 78 населеных пунктаў, якія раней нідзе не згадваліся...**



Сяргей ВАРАНОВІЧ.



Эдуард СКУРАТ.



Наталля ЯЦКЕВІЧ.



Станіслаў ЮРЭЦКІ.

Аб падрабязнасцях расследавання, якое працягваецца, а таксама пошукавых работах, запланаваных сумесна з Міністэрствам абароны на новы сезон, гаварылі падчас круглага стала «Каб памяталі. Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пошукавы рух у Беларусі», які днямі адбыўся ў прэс-цэнтры Дома прэсы. Акрамя таго, эксперты абмеркавалі пытанне ўвекавечвання і захавання памяці ахвяр трагічных падзей, акцэнтавалі ўвагу на тым, якія меры ў нашай краіне прымаюцца для абароны Перамогі савецкага народа ад шматлікіх фальсіфікацый.

### ЗА ДЗЕСЯЦЬ ДЗЁН ПОШУКУ — ПЯЦЬ ІМЁН

Як адзначыў **начальнік упраўлення па ўвекавечванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войн Узброеных Сіл Міністэрства абароны Сяргей ВАРАНОВІЧ**, народ Беларусі шануе і захоўвае памяць аб загінулых, утрымлівае ў належным стане воінскія пахаванні і магілы ахвяр войн. Гэта, на яго словах, і ёсць адна з форм увекавечвання памяці.

На цяперашні момант на дзяржаўным уліку знаходзіцца 8087 такіх пахаванняў шматлікіх гістарычных перыядаў. З іх 1542 пахаванні належаць ахвярам вайн.

Яшчэ адной з форм увекавечвання памяці, па словах прадстаўніка абароннага ведамства, з'яўляецца ўнясенне ў аўтаматызаваны банк даных «Кніга памяці Рэспублікі Беларусь» інфармацыі аб загінулых або зніклых без вестак. На дадзены момант унесены звесткі аб 547 920 загінулых. З пачатку года банк даных папоўніўся інфармацыяй аб звыш як 2400 чалавек.

— 19 красавіка асабовы склад 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна прыступіў да правядзення палявых пошукавых работ, — паведаміў Сяргей Варановіч. — На гэты год запланавана адпрацаваць 69 аб'ектаў па выяўленні астанкаў чырвонаармейцаў і 27 аб'ектаў, якія маюць дачыненне да справы аб генацыдзе. Мы ўжо адпрацавалі ў чатырох абласцях: Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і Мінскай. З пачатку пошукавага сезона паднялі астанкі 183 загінулых, устанавілі пяць імён. За такі кароткі прамежак часу гэта вялікая лічба.

За апошнія 10 гадоў падчас правядзення палявых пошукавых работ асабовым складам 52-га батальёна выяўлены і падняты астанкі звыш 6,5 тысячы ахвяр войн. Дапамагаюць пошукавікам у гэтай высакароднай справе прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў.

Як заўважыў начальнік упраўлення па ўвекавечванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войн Узброеных Сіл, каля вытокаў пошукавага руху Беларусі стаялі родныя і блізкія загінулых і тых, хто ў гады Вялікай Айчыннай знік без вестак. «Пошук пахаванняў, інфармацыі аб загінулых і зніклых без вестак абаронцаў Айчыны сталі патрэбай душы многіх беларусаў, — падкрэсліў Сяргей Варановіч. — У краіне склалася сістэма арганізацыі палявых пошукавых работ, якая забяспечвае планамернае і якаснае іх правядзенне, паважлівае стаўленне да астанкаў загінулых, іх перапахаванне з адданнем воінскіх ушанаванняў. Пры гэтым улічваецца асабістая бяспека ўдзельнікаў пошукавых работ, ажыццяўляецца ўлік спадарожных знаходак і артэфактаў. Толькі за апошнія пяць гадоў пошукавых экспедыцый з грамадскімі аб'яднаннямі адпрацавана звыш 130 аб'ектаў, падняты і перапахаваны астанкі больш чым 1500 ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, устаноўлены звесткі аб 124 загінулых і зніклых без вестак».

### НА СЕМДЗЕСЯТ ВОСЕМ СПАЛЕНЫХ ВЁСАК БОЛЬШ

Дарэчы, пад кіраўніцтвам Міністэрства абароны сфарміравана міжведамасная камісія па ўвекавечванні ахвяр генацыду беларускага народа. Месцы спачыну многіх з іх яшчэ трэба ўстанавіць. Гэтым актыўна займаецца Генеральная пракуратура.

— Ва ўзаемадзеянні з 52-м асобным спецыялізаваным пошукавым батальёнам былі праведзены раскопкі ў 12 раней невядомых месцах знішчэння мірных жыхароў, у выніку чаго паднялі астанкі больш як дзвюх тысяч чалавек, — паведаміў **старшы пракурор упраўлення Генеральнай пракуратуры па наглядзе за расследаваннем асабліва важных крымінальных спраў Эдуард СКУРАТ**. — Паводле даследавання касцяных астанкаў, эксперты зрабілі выснову аб гвалтоўнай прычыне смерці і даўнасці пахаванняў, якія адпавядаюць перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Яны таксама ўстанавілі, што забойствы ажыццяўляліся выстралам у патыліцу чалавека, які стаяў на каленях. Гэта з'яўляецца адным з доказаў таго, што дзеянні праводзіліся наўмысна і былі накіраваны на знішчэнне насельніцтва. Акрамя таго, аб планамерным характары забойстваў грамадзян сведчаць знойдзеныя на месцы прадметы адзення, асабістыя рэчы, шматлікія стрэляныя гільзы, кулі, касцяныя астанкі дзяцей. Усе гэтыя людзі сталі ахвярамі нацысцкай палітыкі генацыду, накіраванай на татальнае знішчэнне 75 % насельніцтва Беларусі. Астатнія 25 % меркавалася выкарыстоўваць у якасці рабоў. Гэта пацвярджаецца колькасцю вывезеных жыхароў БССР на прымусовыя работы — больш чым 380 тысяч чалавек.

Як дадаў прадстаўнік ведамства, у работу па крымінальнай справе па факце генацыду насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўцягнуты супрацоўнікі пракуратур усіх узроўняў: ад генеральнай пракуратуры да пракурораў раёна. «Створана следчая група, у склад якой уваходзіць больш як 800 чалавек, з якіх звыш 600 супрацоўнікаў пракуратуры, — удакладніў Эдуард Скурат. — Дзякуючы гэтаму за мінулы год па крымінальнай справе дапытана больш як 14 тысяч чалавек, з іх 7,7 тысячы — былых вязняў».

У выніку карпатлівай работы па крымінальнай справе пракурорскімі работнікамі атрыманы звесткі аб 78 раней невядомых населеных пунктах, спаленых у гады Вялікай Айчыннай вайны акупантамі і іх памагатымі. «У цяперашні час дадатковыя звесткі, устаноўленыя падчас расследавання крымінальнай справы і прадстаўленыя вучонымі, правяраюцца і замацоўваюцца следчым шляхам, — расказаў Эдуард Скурат. — Па ініцыятыве Генпракуратуры пры супрацоўніцтве з Нацыянальным архівам, Нацыянальным кадастравым агенцтвам на публічнай кадастравай карце апублікаваны прасторавы слой, які змяшчае інфармацыю аб месцазнаходжанні населеных пунктаў сучаснай тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, спаленых нямецка-фашысцкімі акупантамі і іх памагатымі. На карце іх больш як 5,7 тысячы. І гэта работа працягваецца».

Акрамя таго, Генпракуратурай устаноўлены 23 раней невядомыя месцы прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва на тэрыторыі БССР. У прыватнасці, на тэрыторыі Лідскага раёна Гродзенскай вобласці выяўлена месца прымусовага ўтрымання — канцлагер для дзяцей. Паводле атрыманых звестак, дзеці выкарыстоўваліся ў якасці донараў крыві для параненых нямецкіх салдат. Ад забору крыві дзеці хварэлі, у выніку чаго паміралі. Хавалі іх каля школы — на ўчастку мясцовасці, дзе дагэтуль гулялі ў футбол. Тых, хто спрабаваў уцячы, расстрэльвалі на месцы і там жа хавалі. Канцлагер праіснаваў з 1943 года да вызвалення Беларусі.

«Усе гэтыя дадатковыя звесткі сведчаць аб маштабах трагедыі, аб намеры на татальнае знішчэнне нашага насельніцтва», — рэзюмаваў прадстаўнік ведамства.

### ЗАХАВАЦЬ КОЖНЫ ФАКТ

Устаноўленыя Генеральнай пракуратурай факты патрабуюць далейшага навуковага асэнсавання. Як паведаміў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Станіслаў ЮРЭЦКІ**, пасля ўзбуджэння крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд вучонымі была актывізавана работа па актуальных кірунках шматлікіх перыядаў гісторыі Другой сусветнай вайны. «У прыватнасці, па гісторыі судовага працэсу, які праходзіў у Міжнародным ваенным трыбунале ў Нюрнбергу, таксама ў частцы рэалізацыі так званага генеральнага плана «Ост», распрацаванага ўладамі гітлераўскай Германіі, па гісторыі нацыяналістычнага калабарацыяніцкага руху на тэрыторыі БССР у даваенны перыяд, у гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны час», — акцэнтаваў увагу Станіслаў Юрэцкі.

Ён расказаў, што за мінулыя пасля Вялікай Айчыннай вайны дзесяцігоддзі вучонымі Акадэміі навук апублікавана больш чым 12 тысяч навуковых прац. Сярод найбольш знакавых — унікальная 146-томная хроніка кніг «Памяць», адзіны на постсавецкай прасторы вучэбна-метадычны комплекс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа» (у кантэксце Другой сусветнай вайны).

— Усё менш становіцца непасрэдных сведак і ўдзельнікаў тых трагічных, але ў той жа час і гераічных падзей, — адзначыў Станіслаў Юрэцкі. — Таму для нас жыццёва важна захаваць кожны факт, кожную дэталь — усё тое, што стала ўвасабленнем сілы беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З мэтай увекавечвання і захавання памяці аб пакаленні пераможцаў Нацыянальная акадэмія навук Беларусі выступіла з ініцыятывай правядзення ўсебеларускай акцыі «Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны: успомнім усіх!» Мы ажыццяўляем збор інфармацыі, яе апрацоўку з наступнай падрыхтоўкай і выданнем кніг, зборнікаў. Першая кніга ўжо выдадзена, сёлета ўбачыць свет другая.

Акрамя таго, сёлета Нацыянальная акадэмія навук Беларусі аб'явіла рэспубліканскі конкурс творчых работ, прысвечаных Году гістарычнай памяці. «Ён накіраваны на ўмацаванне гістарычнай памяці беларускага народа, усведамленне бясспрэчных дасягненняў незалежнай Рэспублікі Беларусь, фарміраванне пачуцця гонару за гераічнае мінулае і здзяйсненне сучаснай дзяржавы, на кансалідацыю грамадства і ўмацаванне нацыянальнага адзінства, падтрымку таленавітых творчых людзей, — заўважыў Станіслаў Юрэцкі. — У конкурсе прадугледжана спецыяльная намінацыя — «Вялікая Айчынная вайна ў памяці маёй сям'і». Чакаецца, што па выніках конкурсу, якія падвядзём восенню, будуць прадстаўлены работы і па тэматыцы генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

### АБ ГЭТЫМ ПАВІННЫ ДАВЕДАЦЦА ЎСЕ

Не застаюцца абыякавымі да праблематыкі і музейныя ўстановы краіны, якім Генеральная пракуратура перадае ўнікальныя дакументы, у тым ліку спадарожныя знаходкі, знойдзеныя падчас пошукавых работ на месцах масавага знішчэння мірнага насельніцтва.

— Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на працягу ўсіх 77 гадоў свайго існавання вядзе работу па захаванні гістарычнай памяці, — зазначыла **загадчыца аддзела гісторыі партызанскага руху Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Наталля ЯЦКЕВІЧ**. — У шмат разоў гэтая работа павялічылася ў бягучым годзе, які аб'яўлены Годам гістарычнай памяці. Узрасла цікавасць да музея з боку грамадзян Беларусі і тых, хто прыязджае ў нашу краіну. Штодзённа праз музей праходзіць паўтары — дзве тысячы чалавек. Па 50 толькі арганізаваных экскурсій мы абслугоўваем штодзённа. У суботу і нядзелю гэтая лічба павялічваецца да 2,5 тысячы чалавек. Вядома, працуем з вялікай нагрузкай, аднак гэта і радуе: мы бачым вялікую цікавасць да нашай пастаяннай, а таксама часовых экспазіцый.

Адна з першых часовых экспазіцый музея сёлета была створана менавіта па тэме «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны». «Першым наведвальнікам гэтай выставы стаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, — расказала Наталля Яцкевіч. — Экспазіцыя была створана па выніках той вялізнай работы, якую зрабіла Генеральная пракуратура Беларусі. Мы паказалі дакументы, якія захоўваюцца ў нашым музеі. Гэта ў першую чаргу акты Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, якая ўжо з моманту вызвалення тэрыторыі Беларусі ў 1944—1945 гадах правяла вялізную работу па даследаванні месцаў масавага знішчэння. Вядома, ахапіць усё камісіяй было ў тыя гады немагчыма: сталі іншыя задачы — па аднаўленні, будаўніцтве жылля для людзей».

З выстаўкі, якая выклікала грамадскі рэзананс, змогуць пазнаёміцца і жыхары іншых рэгіёнаў краіны — мяркуецца, што экспазіцыя будзе прадстаўлена ў кожнай з абласцей. Яе павінны ўбачыць усе жыхары Беларусі, каб яшчэ раз пераканацца, чаму так важна берагчы памяць і праўду аб той жудаснай вайне.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ВЫИГРЫВАЙ С GLO™!»

Настоящие Правила проведения Рекламной игры **«Выигрывай с glo™!»** (далее – **Правила**) определяют порядок проведения рекламной игры **«Выигрывай с glo™!»** (далее – **Рекламная игра**), разработаны в соответствии с законодательством Республики Беларусь, в том числе в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51.

**1. Общие положения**

1.1. Сведения об организаторе рекламной игры.

Организатором рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Зе моуст», зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета от 10 января 2017 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192756988 (далее – **Организатор**).

УНП Организатора: 192756988.

Место нахождения Организатора: ул. Корш-Саблина, д. 9, помещение 5Н, г. Минск, 220040.

Почтовый адрес Организатора: ул. Восточная, д. 133, офис 204, г. Минск, 220113.

Адрес электронной почты: hello@themost.by.

1.2. Заинтересованным лицом Рекламной игры является:

